Исполком районного Совета решил:

1. Потребовать от председателей сельсоветов и колхозов создать специальные бригады для строительства домов и приспособленных землянок, в которых было бы возможно зимовать инвалидам войны и их семьям.

2. Предложить председателям сельсоветов и отделу социального обеспечения немедленно организовать воскресники по оказанию помощи инвалидам Отечественной войны в строительстве домов, землянок, заготовке дров и т. д.

3. Предложить заведующему райторготделом тов. Амельковичу произвести заказ на пошив необходимого количества обуви и одежды для инвалидов Отечественной войны, крайне нуждающихся в этом, а также выделять 15 % всех товаров рыночного фонда, прибывающих райпотребсоюзу.

4. Обязать заведующего отделом соцобеспечения тов. Радкевича о выполнении данного решения информировать исполком райсовета к 10 ноября 1944 года.

Председатель исполкома райсовета *Жильский*
Секретарь исполкома райсовета *Пивоваров*

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 59. Воп. 2. Спр. 2. Л. 192.*

## Баявая слава Мазыршчыны

### Героі Савецкага Саюза

**Барысаў Міхаіл Уладзіміравіч** (н. 16.4.1923 г. у в. Нараўшчызна) — Герой Савецкага Саюза (1945). Скончыў Гомельскі аэраклуб, ваенна-марское авіяцыйнае вучылішча. З жніўня 1944 г. лейтэнант Барысаў ваяваў на Балтыйскім флоце, быў камандзірам звяна, намеснікам камандзіра эскадрыллі 8-й мінна-тарпеднай авіядывізіі.

За 10 месяцаў 1944—1945 гг. М. У. Барысаў зрабіў 47 баявых вылетаў, патапіў 9 і пашкодзіў 2 транспарты праціўніка водазмяшчэннем 80 тыс. тон. Умелай атакай патапіў нямецкі лінкор «Шлезвіг-Гальштэйн».

Да 1960 г. падпалкоўнік М. У. Барысаў служыў у Савецкай Арміі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

Дзіўныя лёсы бываюць і ў людзей, знешне непрыкметных, і ў населеных пунктаў. Невялікая вёска Нараўшчызна — усяго два дзесяткі хат было да вайны — стала радзімай двух Герояў Савецкага Саюза: М. У. Барысава і М. В. Мураўёва.

Міхаіла Барысава старажылы памятаюць яшчэ хлапчуком. Яніна Шчапаноўская паказала месца, дзе калісьці стаяла хата Барысавых.

— Добрыя былі людзі, — гаворыць Яніна Людвігаўна, — бацька, вясковы фельчар, дапамагаў сялянам, лячыў і словам і справай. І дзеці пайшлі ў бацьку. Міша добра вучыўся. Стаў лётчыкам, і не проста лётчыкам — Героем. Некалькі разоў прыязджаў у Нараўшчызну пасля вайны. Хата іх у Мазыры згарэла ў вайну. І вось ён, Герой, у званні маёра, з сякерай завіхаўся каля новай будыніны. Не паехаў, пакуль не закончылі зруб. Не любіў расказваць пра свае баявыя подзвігі, пра іх у нас хадзілі легенды...

**Катлавец Міхаіл Паўлавіч** (н. 25.10.1914 г. у в. Лешня) — Герой Савецкага Саюза, камандзір танкавага батальёна. Да вайны скончыў Мінскі педінстытут і быў адразу прызваны ў Чырвоную Армію. Пачынаў вайну камандзірам танка, а ў чэрвені 1942 г. ужо камандаваў танкавым батальёнам. Асабліва вызначыўся ў баях восенню 1944 г. у Малдавіі. Узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага, баявымі медалямі. Загінуў 6.10.1944 г.

Ужо тры гады капітан Катлавец на фронце, а здаецца, што ваяваў усё жыццё. Танк даўно стаў нібы родным домам... Цяжкія баі вёў танкавы корпус у студзені 1944 г. у раёне Кіраваграда. Вораг бесперапынна контратакаваў, у баі за станцыю Лялекаўка экіпаж танка Катлаўца знішчыў сем танкаў, у адзін з самых напружаных дзён адбіў шэсць контратак. У наступных баях батальён, якім камандаваў капітан Катлавец, імклівым ударам завалодаў плацдармам на правым беразе р. Днестр і ўтрымліваў яго да прыходу асноўных сіл. Не адзін дзесятак танкаў, гармат САУ і ін-



М. У. Барысаў



М. П. Катлавец



М. В. Мураўёў



В. З. Харужая

шай варожай тэхнікі знайшлі тут сваю магілу.

А потым былі напружаныя, цяжкія баі на чужой тэрыторыі ў Венгрыі. Танкавы батальён пад камандаваннем Катлаўца ведаў адзін напрамак — толькі наперад. Ужо блізкай была перамога, яе промні далёка на захадзе бачыў кожны баец... У пачатку кастрычніка 1944 г. за два дні баёў экіпаж танка капітана Катлаўца знішчыў пяць варожых гармат, каля сотні фурманак, не менш чым роту жывой сілы. Адзін з такіх баёў стаў апошнім для М. П. Катлаўца.

Імем Героя Савецкага Саюза М. П. Катлаўца названы вуліцы ў Цірaспалі і ў Мазыры.

**Мураўёў Міхаіл Васілевіч** (н. 15.5.1919 г. у в. Нараўшчызна) — Герой Савецкага Саюза, камандзір батарэі.

Пасля заканчэння тэхнікума працаваў электрамеханікам на Мазырскай ДРЭС. У 1939 г. прызваны ў Чырвоную Армію, скончыў Пензенскае артылерыйскае вучылішча. Камандзір батарэі 327-га асобнага знішчальнага супрацьтанкавага дывізіёна. Вызначыўся 25 верасня 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Пераяслаўля-Хмяльніцкага. Малодшы лейтэнант Мураўёў знішчыў некалькі агнявых кропак ворага, забяспечыў паспяховае наступленне пяхоты і танкаў. За два дні батарэя Мураўёва адбіла некалькі контратак, знішчыла тры гарматы, чатыры мінамёты, 16 кулямётаў, мінамётную батарэю.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны II ст., двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр у 1981 г., пахаваны ў г. Нікапалі Днепрапятроўскай вобласці.

**З узнагароднага ліста на М. В. Мураўёва**

...У ходзе імклівага наступлення батарэя агнём разбурыла ўмацаванні і знішчыла агнявыя сродкі праціўніка, выйшла да Дняпра і пад моцным агнём фарсіравала раку.

8.10.1943 г. батарэя Мураўёва М. В. знішчыла батарэю 75-мм і 37-мм гармат праціўніка, 4 ротных мінамёты, 5 станкавых кулямётаў з прыслугай і 50 гітлераўцаў.

12.10.1943 г. у баі за в. Худаяраў батарэя Мураўёва М. В. знішчыла дзве 75-мм гарматы, 6 станкавых кулямётаў, мінамётную батарэю і 40 гітлераўцаў, авалодала вёскай і замацавалася на вышыні 160,9.

20.10.1943 г. у баі за г. Крамянчуг мал. лейтэнант Мураўёў праявіў мужнасць і храбрасць...

*ЦАМА РФ. Ф. 38. Воп. 793 756. Спр. 32. Л. 207.*

**Харужая Вера Захараўна** (н. 14(27).9.1903 г.) у 1919 г. скончыла Мазырскую адзіную працоўную школу 2-й ступені, настаўнічала на Палессі. У лістападзе 1920 г. у складзе камуністычнага батальёна змагалася супраць банд Булак-Балаховіча. Пасля грамадзянскай вайны працавала ў Мазырскім павятовым камітэце камсамола загадчыкам палітаддзела.

Тут, на Мазыршчыне, В. З. Харужая прайшла першую школу грамадзянскай загартоўкі, якая вызначыла яе далейшы гераічны лёс — лёс палымянай патрыёткі і рэвалюцыянеркі. З лютага 1924 года яна — адзін з кіраўнікоў падполь-

нага руху ў Заходняй Беларусі, за што была прыгаворана да 8 гадоў турмы. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі В. З. Харужая на партыйнай рабоце на Палессі. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны яна — партызанка атрада В. З. Каржа.

З вясны 1942 г. Вера Захараўна ў апараце ЦК КП(б)Б у Маскве. У верасні 1942 г., пакінуўшы дзяцей на выхаванне сястры, на чале групы накіравалася ў варожы тыл. Стварыла групу ў Віцебскім камуністычным падполлі, перадавала камандаванню Чырвонай Арміі і партызанам каштоўныя звесткі. 13.11.1942 г. арыштавана і закатавана фашыстамі.

В. З. Харужай прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Яе імем названы вуліцы і плошчы ў Мінску, Віцебску, Мазыры, Бабруйску і іншых гарадах Беларусі. У Мазыры, Пінску і Віцебску В. З. Харужай устаноўлены помнікі, мемарыяльныя дошкі.

### ПІСЬМО В. З. ХАРУЖАЙ САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б П. К. ПАНАМАРЭНКУ З ПРОСЬБАЙ НАКІРАВАЦЬ ЯЕ Ў ДЗЕЮЧУЮ АРМІЮ АБО НА ПАДПОЛЬНУЮ РАБОТУ Ў ТЫЛ ПРАЦІЎНІКА

**Уважаемый тов. Пономаренко!**

Надеюсь, Вы помните, что в начале августа 1941 г., когда я явилась к Вам с поручением из партизанского отряда, Вы, несмотря на мои возражения и просьбы на разрешение вернуться обратно, отправили меня в тыл, потому что у меня оставалось мало времени до родов.

Я подчинилась тогда, уехала, нашла свою семью и 5 октября родила сына. Теперь я живу в Молотовской обл., работаю в колхозе и невыносимо томлюсь от мысли, что в такие грозные дни, когда фашистские изверги терзают и топчут мою Белоруссию, я, отдавшая более 20 лет на борьбу за свободу и счастье моего народа, остаюсь в резерве, веду тихую мирную жизнь.

Я больше так не могу. Я должна вернуться. Я буду полезной. У меня большой опыт работы. Я знаю белорусский, польский, еврейский и немецкий языки. Я готова выполнять любую работу на фронте или в тылу врага. Я ничего не боюсь. В душе накипело столько ненависти, столько жажды борьбы, столько любви и желания отдать всю себя, что я готова идти одна на целые полчища фашистских сволочей.

Да ведь все это понятно. Дела на фронте таковы, что скоро снова будут вестись бои на могилевском, гомельском и минском направлениях. Будут нужны работники, люди. Так не забудьте же обо мне.

Сынок мой подрос немножко, и скоро я смогу его оставить с сестрой и бабушкой. Я жду Вашего отзыва. Жду с горячим нетерпением. Убедительно прошу поручить кому-нибудь ответить хоть несколькими словами на это мое письмо.

Не получили ли Вы в ЦК какие-нибудь сведения о моем муже Корнилове Сергее Гавриловиче... 4 июля 1941 г. был тяжело ранен в бою под Пинском, ...не хочу думать, что он погиб. Итак, до скорого, надеюсь, свидания, когда я буду получать от Вас боевой приказ.

*Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне. Документы и материалы. Мн., 1988. С. 59—60.*

### Кавалеры салдацкага ордэна

**Бібік Фёдар Цярэнцьевіч** (н. у 1910 г. у в. Майская) — сапёр, узнагароджаны ордэнам Славы трох ступеняў. З 1944 г. на 1-м Беларускім фронце. Вызначыўся ў баях на Украіне і ў Польшчы. 5 ліпеня 1944 г. каля г. Ковель зрабіў праход у драцяной загародзе праціўніка, праз які прайшла штурмавая група.

У баях на Сандамірскім плацдарме зрабіў на мінным полі праціўніка праходы для разведчыкаў. 14 студзеня 1945 г. на ўчастку прарыву на правым беразе Віслы пад варожым агнём зрабіў



Ф. Ц. Бібік



К. С. Куркевіч

праход у драцяной загародзе і зняў 140 мін.

Загінуў 5.5.1945 г.

В Козенском школьном музее оформлены стенды о земляке-герое. Один из них рассказывает о таком эпизоде.

Холодная январская ночь 1945 года. Бойцы в маскхалатах, притаившись в кустарниках, пристально наблюдают за вражескими позициями.

— Что будем делать, ребята? — спрашивает у товарищей ефрейтор Бибик.— Фашист бьет, поле заминировано.— Через минуту добавил: — Поступим так. Я иду первый. Если что, подменишь меня, ясно? — обратился он к одному из солдат.

— Яснее ясного,— ответил тот.

И Федор исчезает в снежной пыли. Главное — проползти нейтральную линию, по которой бьют фашисты. Слева, сзади, справа раздаются взрывы. А впереди еще более страшное — минное поле. И вот уже миноискатель прощупывает каждый сантиметр земли. Стоп... Есть мина натяжного действия. Через метр снова, рядом с ней — новая... Что ни метр, то «подарочек». Со стороны Вислы дует ветер, снег все гуще, но это не останавливает сапера. Федор твердо помнит, что он ошибается только раз.

В кустах с тревогой следили за его работой товарищи. А когда его скрыла метель, затаив дыхание, вслушивались в мелодии ветра...

Уже тридцать мин насчитал ефрейтор, вот уже и за полсотню перевалило, потом со счета сбился, а миноискатель подавал и подавал тревожные сигналы о наличии смертоносного металла.

На участке четырех линий вражеских траншей Федор Бибик обезвредил 90 мин натяжного действия и 50 противотанковых. Только когда умолк миноискатель, сапер вздохнул свободно. Он был весь мокрый, будто вышел из парной.

Федор лег, поднял над сабой ракетницу и нажал на курок. И через некоторое время, увидев условный сигнал, пошли вперед советские войска. Фашисты не ожидали такого удара, ибо не знали, что поле на левом берегу Вислы уже разминировано.

«Вперед вырвался сапер Бибик. Быстро и бесшумно сделал проход в заграждении из проволоки и вывел бойцов в тыл первой линии немецкой обороны».

Сколько таких проходов было сделано сапером за время войны! Он с честью выполнил долг воина. Полны ненависти к врагу его письма домой: «Мы гоним проклятого врага 570 км, идем так быстро, что ни одному фрицу из наших рук не вырваться. Их ждет смерть и страх. Мы на подступах к Берлину».

Федор Бибик не дожил до радостного дня Победы. В самом конце войны осколок разорвавшейся вражеской мины смертельно ранил его. Так и не узнал гвардии ефрейтор, что его боевые подвиги будут отмечены третьей высокой наградой — орденом Славы I степени: при жизни на его груди сияли уже два ордена Славы.

*Боровский А., Герасименко Ю. Цветут над Припятью сады. Мн., 1987.*

**Куркевіч Карл Станіслававіч** (н. 17.10.1926 г. у Мазыры) — разведчык, кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З пачатку вайны змагаўся ў партызанскім атрадзе, быў разведчыкам. З верасня 1944 г. у Чырвонай Арміі, аўтаматчык. Вызначыўся 4 лютага 1945 г. у баі каля г. Франкфурт-на-Одэры, пры захопе «языкоў» на чужой тэрыторыі. У апошніх баях, пры прарыве варожай абароны, на левым беразе Одэра знішчыў 31 і ўзяў у палон 2 гітлераўцаў.

*В. Шур*

## Генералы Вялікай Айчыннай

**Дзікан Ігнат Максімавіч** (н. у маі 1900 г. у в. Раеўскія) адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Гомельскай вобласці, генерал-маёр.

У 1919—1938 гг. на савецкай рабоце, старшыня Церахаўскага і Стрэшынскага райвыканкамаў. У Айчынную вайну быў накіраваны ў тыл ворага. З ліпеня 1942 г. камісар 10-й Журавіцкай партызанскай брыгады, адначасова сакратар Журавіцкага падпольнага РК КП(б)Б. З кастрычніка 1943 г. начальнік аператыўнай групы Беларускага штаба партызанскага руху пры Беларускім і 1-м Беларускім фронце.

У мірны час — намеснік старшыні Бабруйскага аблвыканкама. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр 13.2.1948.

**Пашкоўскі Міхаіл Казіміравіч** (н. 22.9.(4.10)1897 г. у м. Скрыгалаў) удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, генерал-маёр.

У арміі з 1916 г., у Чырвонай Арміі — з лістапада 1918 г. Удзельнік баёў на Заходнім фронце, ліквідацыі бандаў Булак-Балаховіча, савецка-фінляндскай вайны.

Скончыў Вышэйшыя курсы пры Ваеннай акадэміі тылу і забеспячэння. У Айчынную вайну — на Карэльскім, Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім і Забайкальскім франтах: камандзір палка, дывізіі, намеснік камандуючага войск па тылу групы войск, арміі.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, сямю іншымі ордэнамі, медалямі.

Памёр 17.10.1970 г.

*В. Шур*

## Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі ў баях за вызваленне Мазыршчыны ў 1941—1944 гг. і пахаваны на тэрыторыі раёна

### ГОРОД МОЗЫРЬ. КУРГАН СЛАВЫ

**АЛЕЗОВ Семен Степанович,** р. в 1916, ст. лейтенант, погиб 5.5.1944.

**АНДРИЕВСКИЙ А. А.,** ряд., погиб 11.1.1944.

**АНДРИЕВСКИЙ Д. М.,** ряд., погиб 11.1.1944.

**АРИСТОВ Александр Никонорович,** р. в 1903, ряд., погиб 12.1.1944.

**АТАМУРАТОВ Джатар,** ряд., погиб 18.1.1944.

**БАЛЫКОВ Яков Н.,** ряд., погиб 1.5.1944.

**БАРАБАШ Петр Кузьмич,** р. в 1908 в с. Бугруватье Ахтырского р-на Омской обл., ряд., погиб 1.4.1944.

**БАРСУКОВ Иван Степанович,** р. в 1900, ряд., погиб 14.3.1944.

**БАХАНОВ Борис Александрович,** р. в 1919 в д. Сосновка Смоленской обл., сержант, умер от ран 17.3.1944.

**БАШКИРОВА Ефросинья Михайловна,** ефрейтор, погибла 5.5.1944.

**БЕЗАКИН Леонид Григорьевич,** р. в 1910, ряд., погиб 5.5.1944.

**БЕЛЕНЧИК Александр Михайлович,** р. в 1907, ряд., погиб 14.3.1944.

**БЕЛОКУР Иван Андреевич,** р. в 1923, сержант, умер от ран 13.11.1944.

**БЕЛОУСОВ Василий Иванович,** р. в 1903, ряд., умер от ран 22.9.1944.

**БЕЛОУШКО Дмитрий Давыдович,** р. в с. Симоновичи Бобруйского р-на Могилевской обл., ефрейтор, умер от ран 18.2.1944.

**БЕЛЯЕВА Вера Григорьевна,** ряд., погибла 5.5.1944.

**БЕРЕЗОВ Виктор Е.,** р. в 1913, капитан, погиб 14.3.1944.

**БЕРЛИЗОВ Иван Ефимович,** р. у 1909 в с. Ивановка Семипалатинской обл., ряд., умер от ран 3.3.1944.

**БЕСЕДИН Иван Васильевич,** р. в Белгородской обл., ряд., погиб 12.1.1944.

**БОБЫЛЕВ К. П.,** р. в 1907, партизан, погиб 14.3.1944.

**БОРИСЕНКО Иосиф Лаврентьевич,** р. в д. Тежица Калинковичского р-на Гомельской обл., умер от ран 8.3.1944.

**БУЗИН Степан Степанович,** р. в с. Николаевка Аннинского р-на Воронежской обл., сержант, погиб 13.2.1944.

**БУРДУН Борис Климович,** р. в 1924 в г. Львов, ряд., погиб 15.1.1944.

**БУРХАНОВ Лукьян Иванович,** ст. сержант, умер от ран 6.5.1944.

**БУРЯК Мирон Борисович,** р. в с. Ковалин Киевской обл., ряд., погиб 12.1.1944.

**ВАРШАВЕР Семен Яковлевич,** р. в г. Чимкент, ряд., погиб 12.1.1944.

**ВЕРСТАКОВ Иван Георгиевич,** р. в 1907, майор, умер от болезни 25.12.1944.

**ВЕРШКОВ А. И.,** моряк, погиб 12.1.1944.

**ВИШНИЧКИН Владислав Георгиевич,** р. в 1924, ряд., погиб 14.3.1944.

**ВЛАСОВ Федор Никифорович,** р. в Сталинградской обл., ряд., умер от ран 17.2.1944.

**ВОЛЖИН Я. В.,** р. в 1886, ряд., погиб 14.3.1944.

**ВОРОБЬЕВ Ефрем Семенович,** р. в Брянской обл., мл. лейтенант, погиб 12.1.1944.

**ГАРЕЛО Антон Д.,** р. в 1926, ряд., погиб 5.5.1944.